Назва ТВП: Прыпяцкія балоты

© Д. Винчевский

Код: BY036

Геаграфічныя каардынаты: 52°00' N 28°00' E

Адміністрацыйная прыналежнасць: Гомельская вобласць: Жыткавіцкі раён, Лельчыцкі раён, Петрыкаўскі раён

Плошча: 82461 га

Крытэрыі: A1, B2, B3

Нацыянальны прыродаахоўны статус: Нацыянальны парк «Прыпяцкі»

Міжнародны прыродаахоўны статус: ТВП міжнароднага значэння. Ключавая батанічная тэрыторыя

Агульнае апісанне:

Нацыянальны парк размешчаны ў пашыранай частцы старажытнай даліны ракі Прыпяць ў міжрэччы яе правых прытокаў – рэк Сцвіга і Убарць. Тэрыторыя ўяўляе сабой вялікую нізінную раўніну з агульным ухілам да поймы Прыпяці. Паўднёвая мяжа парка супадае з паўднёвым краем раўніны і прадстаўлена пясчанымі ўзгоркамі і дзюнамі, якія зараслі хвойнымі лясамі. За дзюнамі шырокім поясам працягнуліся буйнейшыя на Палессі верхавыя і пераходныя балоты, якія дзякуючы сваёй некранутасці і багатай біяразнастайнасці могуць з’яўляцца эталонам палескіх балот.

Большая частка балот нацыянальнага парка пакрыта хвойнікамі, хаця і даволі значная іх плошча (каля 15%) застаецца бязлеснай. Бліжэй да поймы верхавыя і пераходныя балоты змяняюцца нізіннымі; яны, ў сваю чаргу – паласой вельмі забалочаных, часам непраходных, алешнікаў, якія перамяжоўваюцца з адкрытымі альбо зарослымі хмызняком нізіннымі балотамі. Паласа алешнікаў пераходзіць у заліўныя шыракаліставыя лясы, сярод якіх пераважаюць дубравы (13,6% ад агульнай плошчы лясоў). Менавіта пойменныя дубравы прыдаюць палескім ландшафтам непаўторны каларыт. Па краях поймы дубравы размяшчаюцца суцэльнымі палосамі, а бліжэй да ракі перамяжоўваюцца з шырокімі адкрытымі заліўнымі лугамі і шматлікімі старыцамі.

Асноўнымі вадацёкамі нацыянальнага парка «Прыпяцкі» з’яўляюцца рэкі Сцвіга і Убарць, якія абмяжоўваюць тэрыторыю з усходу і захаду. Па цэнтральнай частцы парка працякае яшчэ адна невялікая (каля 30 км), але дастаткова мнагаводная рака Свінавод. Акрамя натуральных буйных вадацёкаў і невялікіх азёр, якіх налічваецца крыху болей 40, на тэрыторыі парка захавалася сетка каналаў, якія былі пракапаны яшчэ ў канцы XIX стагоддзя ў часы заходняй экспедыцыі І.І. Жылінскага для лесасплаву. Агульная працягласць каналаў складае амаль 280 кіламетраў. Дзякуючы дзейнасці баброў і натуральнаму разбурэнню большая частка гэтых каналаў не аказвае істотнага ўздзеяння на гідралагічны рэжым парка.

Флора парку налічвае каля 900 відаў высшэйшых раслін. Сярод іх 22 віда дрэў, 32 віда хмызнякоў, 196 відаў імхоў, 184 відаў лішайнікаў, 321 від водарасцяў.

У нацыянальным парку пераважаюць наступныя віды гаспадарчай дзейнасці: абмежаваная высечка лясоў, сенакашэнне, выпас жывёлы, паляўнічы турызм, рыбалка.

Асноўныя біятопы:

Лясы – 77,4% (сярод іх саснякі - 45,6%; дубравы 12,2%; бярэзнікі – 19,5%; чорнаальшаннікі – 8,1%), балоты верхавыя – 2,7%, балоты пераходныя – 4,5%, балоты нізінныя – 3,4%, азёры, рэкі, канавы – 1,9%, сельскагаспадарчыя землі – 1,3%, лугі – 1,3%.

Птушкі:

Пачынаючы з 1926 г. на тэрыторыі Нацыянальнага парку “Прыпяцкі” адзначана 255 відаў птушак, з якіх 193 віда на гнездаванні, 46 - на міграцыі, 16 - залётных. У 2011 г. пад кіраўніцтвам В.Ч. Дамброўскага праведзена навукова-даследчая праца “Подготовка и издание атласа зверей и птиц Национального парка “Припятский”. На гнездаванні выяўлена 173 віда, 6 з якіх толькі у буфернай зоне Нацыянальнага парку. Стан рэдкіх гняздзяшчыхся відаў птушак прадстаўлены па выніках гэтай працы.

ТВП “Прыпяцкія балоты” маюць міжнароднае значэнне для захавання відаў, якія знаходзяцца пад глабальнай пагрозай знікнення: вялікі арлец *Aquila clanga*, дубальт *Gallinago media,* вялікі грыцук *Limosalimosa.* А таксама рэгіянальнае значэнне для захавання такіх відаў як чорны бусел *Ciconianigra*, арол-вужаед *Circaetusgallicus*, шэры журавель*Grusgrus*, малая крычка *Sterna albifrons*, пугач *Bubo bubo*, шэрая кугакаўка *Strix aluco*, звычайны ляляк*Caprimulguseuropaeus*, сярэдні дзяцел *Dendrocopos medius.*

Наяўнасць такой колькасці відаў нацыянальнай і міжнароднай значнасці падкрэслівае важнасць тэрыторыі для захавання біялагічнай разнастайнасці Палесся, Беларусі і Еўропы ў цэлым.

Іншыя групы жывел:

Фауна млекакормячых Нацыянальнага парка «Прыпяцкі» налічвае 53 віда, 13 відаў амфібій, 7 відаў рэптылій, 39 відаў рыб.

Стан рэдкіх відаў птушак:

Віды	Статус	Колькасць	Год/перыяд ацэнкі	Дакладнасць ацэнкі	Трэнды	Крытерый ТВП
Качка-шылахвостка *Anas acuta*	гн	< 10 п	2011	Э		

Віды	Статус	Колькасць	Год/перыяд ацэнкі	Дакладнасць ацэнкі	Трэнды	Крытерый ТВП
Чапля-бугай *Botaurus stellaris*	гн	+	2011	П		
Чапля вялікая белая *Casmerodius albus*	зал	+	2011	П		
Чорны бусел *Ciconia nigra*	гн	10-50 п	2011	Э		B2
Каршун чорны *Milvus migrans*	гн	1-2 п	2011	Э		
Арлан-белахвост *Haliaeetus albicilla*	гн	5 п	2011	Д		
Арол-вужаед *Circaetus gallicus*	гн	> 10 п	2011	Э		B2
Лунь палявы *Circus cyaneus*	гн	< 10 п	2011	Э		
Малы арлец *Aquila pomarina*	гн	13 п	2011	Д		
Арлец вялікі *Aquila clanga*	гн	6 п	2011	Д		A1
Сокал-кабец *Falco subbuteo*	гн	5-7 п	2011	Э		
Драч *Crex crex*	гн	250 с	2011	Э		

Віды	Статус	Колькасць	Год/перыяд ацэнкі	Дакладнасць ацэнкі	Трэнды	Крытерый ТВП
Журавель шэры *Grus grus*	гн	> 50 п	2011	Э		B2
Крывок *Haematopus ostralegus*	гн	< 10 п	2011	Э		
Сеўка залацістая *Pluvialis apricaria*	гн	6-8 п	2011	Э		
Зуёк вялікі *Charadrius hiaticula*	гн	10-50 п	2011	Э		
Баталён *Philomachus pugnax*	гн	10-50 п	2011	Э		
Дубальт *Gallinago media*	гн	> 20 п	2011	Э		A1
Грыцук вялікі *Limosa limosa*	гн	> 50 п	2011	Э		A1
Кулён сярэдні *Numenius phaeopus*	гн	4-5 п	2011	Э		
Кулён вялікі *Numenius arquata*	гн	2 п	2011	Д		
Кулік-марадунка *Xenus cinereus*	гн	< 10 п	2011	Э		

Віды	Статус	Колькасць	Год/перыяд ацэнкі	Дакладнасць ацэнкі	Трэнды	Крытерый ТВП
Чайка малая *Hydrocoloeus minutus*	гн	< 10 п	2011	Э		
Крычка малая *Sternula albifrons*	гн	10-50 п	2011	Э		B2
Рыбачка белашчокая *Chlidonias hybrida*	гн	10-50 п	2011	Э		
Пугач *Bubo bubo*	гн	13-15 п	2011	Д		B2
Сычык вераб’іны *Glaucidium passerinum*	гн	300-400 п	2011	Э		
Сыч-сіпель *Athene noctua*	гн	< 10 п	2011	Э		
Кугакаўка барадатая *Strix nebulosa*	гн	< 10 п	2011	Э		
Кугакаўка шэрая *Strix aluco*	гн	> 100 п	2011	Э		B3
Ляляк звычайны *Caprimulgus europaeus*	гн	> 350 п	2011	Э		B3
Звычайны зімародак *Alcedo atthis*	гн	10-50 п	2011	Э		

Віды	Статус	Колькасць	Год/перыяд ацэнкі	Дакладнасць ацэнкі	Трэнды	Крытерый ТВП
Жаўна зялёная *Picus viridis*	гн	10-50 п	2011	Э		
Дзяцел сярэдні *Dendrocopos medius*	гн	> 100 п	2011	Э		B2
Дзяцел беласпінны *Dendrocopos leucotos*	гн	> 100 п	2011	Э		
Дзяцел жоўтагаловы *Picoides tridactylus*	гн	50-100 п	2011	Э		
Валасяніца-белашыйка *Ficedula albicollis*	гн	> 100 п	2011	Э		
Сініца белая *Cyanistes cyanus*	гн	+	2011	П		

Іншыя рэдкія і знаходзячыеся пад пагрозай знікнення віды:

Звяры: малая вячэрніца *Nyctalus leisleri*, соня-палчок *Myoxus glis*, арэшнікавая соня *Muscardinus avellanarius*, барсук *Meles meles*, рысь *Felis linx*, белавежскі зубр *Bison bonasus.*

Птушкі: белавокі нырок *Aythya nyroca*, сокал-шулёнак *Falcovespertinus*, малы пагоніч *Porzana parva*, кулік-паручайнік *Tringa stagnatilis,* шызая чайка *Larus canus* , сіпуха *Tytoalba*, балотная сава *Asio flammeus*, сіваграк *Coracias garrulus*, шчурка-пчалаедка *Meropsapiaster*, палявы свірстун *Anthus campestris*, чарналобы грычун *Laniusminor*

, вусатая сініца *Panurusbiarmicus*, садовая стрынатка *Emberizahortulana*, вяртлявая чаротаўка *Acrocephalus paludicola* (гэтыя віды адзначаліс на гнездаванні раней, але ў 2011 г. не вызначыны).

Амфібіі: чаротавая рапуха *Bufocalamita*, грабеньчаты трытон *Trituruscristatus.*

Рэптыліі: балотная чарапаха *Emysorbicularis*, мядзянка *Coronellaaustriaca*.

Рыбы: вусач *Barbusbarbus*, падуст *Chondrostomanasus*.

Насякомыя: адзначана 36 відаў, занесеных у Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь.

Расліны: На тэрыторыі парка зарэгістравана 62 віды раслін, якія занесены ў Чырвоную кнігу і належаць ахове. Сярод іх такія як: альдраванда пухіраватая *A ldrovandavesiculosa*, граздоўнік многараздзельны *Botrychiummultifidum*, сон лугавы *Pulsatillapratensis*, рададэндран жоўты *Rhododendronluteum*, сальвінія плывучая *S alvinianatans*, ліле́я кучаравая *Liliummartagon*, гарлачык белы *Nymphaeaalba*, пылкагалоўнік чырвоны *Cephalantherarubra*, гайнік цёмна-чырвоны *Epipactis atrorubens* і іншыя.

Пагрозы:

- Змяненне гідралагічнага рэжыму поймы ракі Прыпяць у выніку асушальнай меліярацыі і абвалавання рэк.
- Раслінныя сукцэсіі. У выніку парушэння гідралагічнага рэжыму і скарачэння сенакашэння заліўныя лугі зарастаюць хмызняком, што прыводзіць да змяншэння разнастайнасці біятопаў і збяднення біялагічнай разнастайнасці.
- Лесагаспадарчая дзейнасць. Пасля пераўтварэння запаведніка ў нацыянальны парк лесагаспадарчая дзейнасць на яго тэрыторыі значна пашырылася, што аказала істотны негатыўны ўплыў на экасістэмы. У цяперашні час лесагаспадарчая дзейнасць перамясцілася ў лясныя масівы, размешчаныя за тэрыторыяй парка.
- Пажары аказваюць істотнае ўздзеянне на экасістэмы парка. Яны здараюцца даволі часта і ахопліваюць значныя плошчы.

Рэкамендацыі па захаванню:

Для вырашэння экалагічных праблем неабходна распрацаваць комплексны план кіравання нацыянальным паркам «Прыпяцкі». Асаблівая ўвага павінна быць

нададзена правядзенню спецыяльнага лесаўпарадкавання і аптымізацыі гідралагічнага рэжыму.

Крыніцы інфармацыі:

Домбровский В.Ч., Онищук С.В., Дмитренок М.Г., Лундышев Д.С. Численность филина в Национальном парке «Припятский» // Красная книга Республики Беларусь: состояние, проблемы, перспективы: материалы международной научной конференции, Витебск, 13-15 декабря 2011 г. – Витебск., 2011 г. – с. 47-49.

Ключевые ботанические территори Беларуси / Под ред. О.М. Масловского, Г.А. Пронькиной. – М.-Мн. -: Бестиор, 2005. – 80 с.

Отчет о НИР “Подготовка и издание атласа зверей и птиц Национального парка “Припятский”, рук. НИР В.Ч. Домбровский, Минск, 2011 г.

Скарбы прыроды Беларусі. – Мн.: Беларусь, 2005. – 215 с. (Інфармацыю падрыхтавалі: Дамброўскі В.Ч., Клакоцкі В.П., Мангін Э.А.,Мароз М.Д., Нікіфараў М.Я., Пінчук П.В., Углянец А.У.)

Складальнікі : Левы С.В.

---

* *Выкарыстанне змешчанай тут неапублікаванай інфармацыі для навуковых публікацый без пісьмовай згоды яе аўтараў забаронена. У выпадку выкарыстання часткі кантэнту або старонкі цалкам на іншых інтэрнет-рэсурсах, абавязковая спасылка на аўтараў і сайт iba.ptushki.org*